Агульнае ў гэтых героях тое, што яны прыносяць навіны аб грамадскіх працэсах, аб усім, што адбываецца за межамі хаты Зяблікаў, агітуюць за рэвалюцыю; увогуле адсутнасць у іх імёнаў надае вобразам сімвалічнасці. Але даследчыкі літаратурны сыходзяцца ў тым, што Незнаёмы – «вобраз умоўны, абстрагаванае выражэнне рэвалюцыйнай ідэі», «ён створаны выключна прыёмамі сімволіка-рамантычнага пісьма, без псіхалагічнай дэталізацыі, гэта своеасаблівы рупар аўтарскіх ідэй» [4, с. 152]. У адрозненне ад Незнаёмага, Старац прадстаўлены ў драме, як жывы, рэальны чалавек.

Ён мае шырокія погляды, добра ведае жыццё народа, яго думкі і спадзяванні. Мова яго насычана размоўна-бытавой лексікай, але не пазбаўлена годнасці; у ёй шмат прыказак, якія ўвасабляюць мудрасць народа («Свайго не меўшы – трэба легчы спаць не не еўшы», «Там добра, дзе нас няма», «Заўсёды бяда біду вядзе», «Чалавек страляе, а чорт кулю носіць» [2, с. 346 – 347]. Старац не пакарыўся свайму лёсу, калі зрабіўся жабраком, а заклікае і іншых ніколі не здавацца: «Ганьба таму чалавеку,што рукі апусціць, як паравяслы, і чакае, пакуль сама доля к яму прыйдзе ў хату і папросіцца, каб прыняў яе з ласкі свае! Ганьба таму, хто, вочы на ўсё заплюшчыўшы, будзе ісці ўцёртай здавён сцежкай няпраўды і бяспраўя, думаючы, што іначай быць ніколі не можа і што не ў яго волі змяніць стары парадак бессумленнага жыцця! Ганьба таму…» [2, с. 403]. Ён тонка адчувае надыходзячыя змены ў жыцці грамадства: «Цяпер такі на свеце між людзьмі несупакой расце, што не дай ты божачка! ».

Вобраз Старца з’яўляецца глыбока рэалістычным і тым, што знаходзіцца ў дынамічным, «розум у яго − дыялектычны» [3, с. 201]. Стары не з’яўляецца прыкладам акамянелай традыцыйнасці, прыхільнікам старога жыццёвага ўкладу, а разважае і аб сучаснасці: «Слабы сталі цяперашнія людзі: кепскія вочы маюць, каб усё як належыцца бачыць імі, кепскія вушы маюць, каб кожны шорах пачуць і згадаць, адкуль вецер прыхільны вее, і кепскі розум маюць, каб ім раскумекаць усё чыста, дзе дабро іх чакае, а дзе зло» [2, с. 401]. Ён суадносіць свой жыццёвы вопыт, мудрасць народа з сучаснасцю і паказвае, які шлях трэба выбраць.

Характэрная кампазіцыйная асаблівасць – час з’яўлення Старца на сцэне: гэта цяжкае чаканне Зяблікамі выгнання ў пачатку п’есы і поўная страта надзей на будучыню ў канцы. З’яўляючыся ў пераломныя быццёвыя моманты, Старац набывае рысы прарока. Ён месцамі і гаворыць неакрэслена, загадкава, быццам прадказвае: «Але прыйшла пара, выбіла такая шчасная і няшчасная гадзіна, і прабудзілася думка вялікая, важная…» [2, с. 403]. Паказальна, напрыклад, тое, што ў заключнай рэмарцы адзначаецца: « Старац (не галоўная дзеючая асоба! – *Н. З.*) ідзе наперад, за ім…(усе астатнія – *Н. З.*) ».

Пры з’яўленні ў сцэнічным дзеянні купалаўскі Старац вітаецца з усімі словамі «Слава Хрысту, добрыя людзі! », а ў фінале сцвярджае: «Святую песню хоць калі не грэх запець ». [2, с. 407]. Пры гэтым у рэмарцы ўказваецца: «Усе пяюць «Лазара ».. Фалькларыст Е. Раманаў адзначаў у канцы XIX стагоддзя: «Лазар бедны шырока распаўсюджаны на Беларусі, яго спяваюць не толькі старцы, але і ўсе прыгнечаныя і пакрыўджаныя. Здаецца, беларус не супраць таго, каб бачыць у бедным Лазары самога сябе» [1, с. 504].

Такім чынам, перадаючы пэўныя рэлігійныя і філасофскія ідэі, герой змяшчае ў сабе рысы евангельскага прапаведніка і лірніка – вандроўнага народнага песняра (іх у народзе таксама называлі старцамі). Можна сцвярджаць, што вобразу старца, як аднаму з самых пашыраных тыпаў вандроўніка, належыць асаблівае месца ў сацыякультурнай прасторы Беларусі, чаго не пакінуў без сваёй увагі нацыянальны класік Я. Купала .

**Спіс крыніц**

1. *Конан, У. М.* Выбранае / У. М. Конан; уклад. М. А. Козенкі; прад. М. А. Козенкі.— Мінск : Смэлтак, 2009. — 536 с. : іл. — (Выдатныя постаці Беларусі)
2. *Купала, Я.* Паэмы. Драматычныя творы. / Я. Купала; уклад. А. А. Сляпцовай; пасляcл. В. А. Каваленкі; мал. В. П. Шаранговіча. — Мн. : Маст. літ., 1989. — 494 с.
3. *Лойка, А. А.* Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. / А. А. Лойка. — Падруч. для філал. фак. ВНУ. — 2 – е выд., дапрац. і дап. — Мн. : Выш. шк., 1989. — Ч. 2. — 480 с.
4. *Ярош, М. Р.* Пясняр роднай зямлі: Жыццё і творчасць Янкі Купалы. — Мн. : Навука і тэхніка, 1982. — 344 с. : іл.

***Н. У. Здановіч***
*Навуковы кіраўнік — Ж. В. Косціна*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ЭВАЛЮЦЫЯ ВОБРАЗА Ў ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАХ ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ

У творчасці кожнага пісьменніка пэўным чынам адлюстроўваюцца яго старонкі біяграфіі, грамадскія падзеі. Творчасць паэта-рэвалюцыянера, патрыёта і змагара Валянціна Паўлавіча Таўлая можна назваць такім суцэльным адбіткам гісторыі радзімы. Увогуле В. Таўлай не аддзяляў практычнай рэвалюцыйнай дзейнасці ад сваёй літаратурнай працы, паэзія была для яго моцнай зброяй супраць ворагаў: “Глядзі ў ваўчок як дзень, так ноч, − // Не ўбачыш, чорт зіркаты, // Што я заўзята і даўно // Пілую вершам краты” [3, с. 5].

Першы этап творчасці паэта – вершы-пратэсты супраць польскай акупацыі Заходняй Беларусі − названы рэвалюцыйным рамантызмам (прыкладна 1928-1935гг.) [1, с. 8]. Творы гэтага перыяду змяшчаюць у сабе

вялікую колькасць абстрактных вобразаў, рамантычных эпітэтаў, метафар, параўнанняў. У першых сваіх творах В. Таўлай стварае вобразы з'яў прыроды, якія адухаўляюцца. Вершы гэтага перыяду напоўнены аптымізмам, моцным зарадам рэвалюцыйнай энергіі, рэвалюцыйнымі думкамі, што перадаецца праз алегорыю: "…Жаўрукі асерабрылі // Сцежку сонечнаму ранку… // Жаўруковыя вяснянкі – // Быццам звонкія праменні… // … Радасна ўздыхнулі грудзі: // − Адчыняйце хаты, людзі! // − Адчыняйце сэрцы, людзі! // − Вясна будзе! Вясна будзе!" ("Напрадвесні"). Вобраз жаўрука сімвалізуе рэвалюцыянера, змагара, які заклікае да барацьбы: "І нашто ён (жаўрук) ключом серабраным // Нашы сэрцы крануў без пары? // След вясняны ў краіне забранай // Сыпкім снегам заносяць вятры…" Вобраз вясны сімвалізуе абуджэнне, росквіт, новае жыццё, лепшую будучыню. Улюбёнымі вобразамі, якія ўяўляюць сабой адухаўлёныя прыродныя з'явы, з'яўляюцца гром, віхор, бура, маланка [1, с. 7]: " Хай затрашчыць пад буры шквал, // Ланцуг, які Зямлю скаваў; На гром нябёс – маланак гоман – // Народ Зямлі адкажа громам!" ("Жаданне"). Вышэй пералічаныя алегарычныя вобразы ўяўляюць тут рэвалюцыйную сілу, гэта сімвалы надыходзячай рэвалюцыі. Вершы перыяду 1928 − 1929 гг. сведчаць аб пераемнасці вобразаў (бура, навальніца, вясна, гром, сонца) і стылю Янкі Купалы, творы якога былі прыкладам паэтычнай творчасці для В. Таўлая [1, с. 7]. Прасочваецца тут і пераўманне тэматыкі і вобразаў з вершаў Цёткі, асабліва з верша "Мора": "Мора злуе, крэпнуць хвілі, // З дзікім шумам бераг рвуць, // Гром грыміць за вёрсты-мілі, // З мора брызгі ў неба б'юць…"

З канца 1929 года пачынаецца другі, астрожны перыяд творчасці паэта , які можна назваць перыядам сацыялістычнага рэалізму. Сацыялістычны рэалізм − творчы метад савецкай літаратуры і мастацтва, праз які сцвярджаецца ідэя рэвалюцыйнай перабудовы грамадства; асаблівы тып свядомасці [5, с. 655, 563]. У сувязі з гэтым змяняецца і вобразная сістэма паэзіі нашага земляка яго: знікаюць светлыя і аптымістычныя вобразы сонца, зямлі, вясны, з'яўляюцца вобразы маланкі, кратаў, турмы, ветру: "І зноў загарэліся нашыя зоры, − // Аднак не пабачымся мы: // Дарога мая напаткнулася ўчора // На шэрыя сцены турмы" ("Дзяўчыне"). Зоры, якія аўтар згадвае ў творах гэтага часу, з'яўляюцца не сімвалам шчасця, а прадметам настальгіі. Лірычныя творы астрожнага цыклу ў 1929 – 1930 гг. напоўнены ўспамінамі аб шчасці на свабодзе, смуткам, тугой ("Сонейка глянула").

Творчасць перыяду нямецка-фашысцкай акупацыі працягвае тэндэнцыі папярэдняга этапу, толькі ворагі змяніліся: на месца белапалякаў-акупантаў прыйшлі нямецкія захопнікі. У вершах ваеннага перыяду назіраецца пераемнасць мовы і стылю Уладзіміра Маякоўскага [1, с. 6]. У гэты ж перыяд з'яўляюцца і вершы, пранікнутыя глыбокім лірызмам, паказам людской трагедыі: "Чаго ты іржэш тут, мой конь чарнагрывы, // Зямлю ўдараеш капытам? // Яздок усё роўна не ўстане з магілы: // Ён куляй фашысцкай забіты" ("Чаго ты іржэш…"). І ўсё ж, нягледзячы на псіхалагізм, лірызм ("Калі нямая злосць дыхне", "Песня лукішскіх вязняў"), аўтар і тут заклікае да дзеяння: "Слязамі не выплачаш гора з-пад сэрца – // хай гнеў грудзі матчыны ўздыме!". З'яўляюцца ў вершах вобразы, якія ўяўляюць сабою пэўныя сімвалы. Напрыклад, у многіх вершах ("Камень за каменем", "Гэта ўсё – знаёмыя шляхі", "Лісты з турмы") сустракаюцца вобразы шляху, сцежкі, якія сімвалізуюць усё жыццё чалавека. У вершы "Яго, бандыта, на прыцэл вазьмі!" такія радкі: "І загрымелі помстаю прасторы, // Пад громам тым кат устаяць не змог: // Спалоханы, зашыўся ў бункер-горад – // Няма яму ні сцежак, ні дарог" разумеюцца, што ў немца-ката няма ніякіх дарог і шляхоў жыцця, жыцця ўвогуле. Часта ўзнікаюць у вершах ваеннага перыяду вобразы сцяга як сімвала незалежнасці ("Першамайскія сцягі", "Ідзе за годам год", "Бацькава пісьмо"): "Бывай здароў! // Табе забыты сцяг // Узмахвае крылом на прывітанне."

Можна адзначыць, што праз усю паэтычную творчасць В. Таўлая праходзіць вобраз ветру, як сімвал волі, свабоды, і вобраз песні. Гэтыя вобразы аўтар адухаўляе. Песня дапамагае чалавеку, суправаджае яго ўсё жыццё, падымае яго баявы дух, настрой. Вецер выступае то вечным суправаджальнікам чалавека, то змагаром, то быццам паштаром, які ўсё бачыць і прыносіць весткі ("Першамайскія сцягі", "Чаго ты іржэш…", "Шумяць бары", "Хлопцы", "Лістоўка"): "Шумяць бары… Разносіць вецер песню, // А ў ёй пяе, што хутка ўжо вясна…"

Паэзія В. Таўлая перыяду 1945 – 1947 г.г. кардынальна змяняецца і вобразамі, і стылем, і моваю. Паэт гаворыць аб той невымернай радасці, якая ахапіла людзей, калі гады напружання скончыліся бліскучай перамогай ("Кастрычніцкі салют", "Я аддаю шчыры голас салдацкі") [1. с.17]. Гэта ўжо зноў насычаная разнастайнымі мастацкімі сродкамі паэзія, напісаная ўзнёслай, урачыстай мовай. Аўтар зноў звяртаецца да вобразаў зор, ранку як сімвалаў адраджэння, новага ладу жыцця ("Ранак перамогі", "Кастрычніцкі салют"), у вершы вяртаецца вобраз вясны: "Кожны з нас тады лёгка, глыбока ўздыхнуў. // Здзівіліся ўсе: ціхі гэтакі ранак… // І пазналі яе, – залатую вясну, // Аж занылі ад радасці даўнія раны."

Такім чынам, можна сцвярджаць, што Валянцін Таўлай прайшоў у сваёй творчасці шлях ад рэвалюцыйнага рамантызму да рэвалюцыйнага рэалізму і ад апошняга да так званага светлага сацыялістычнага рэалізму, што ў поўным аб'ёме адбілася на ўжываемых вобразах, сродках выразнасці, мове паэтычных твораў. Прычына гэтага –гістарычныя падзеі, грамадскія працэсы, якія аказалі вялікі ўплыў на жыццёвы шлях і творчасць паэта.

**Спіс крыніц**

1. *Таўлай, В. П.* Выбраныя творы / В. П. Таўлай ; уступ. арт. Я. Шарахоўскага. — Мн. : Дзяржвыд. БССР, 1951. — 218 с.
2. *Таўлай, В. П.* Выбраныя творы : вершы і паэмы / В. П. Таўлай ; уступ. арт. У. Мехава. — Мн. : Вучпед. БССР, 1958. — 162 с.
3. *Тавлай, В. П.* Я с вами : стихи и поэмы / В. П. Тавлай ; вступительная статья В. Колесника. — Мн. : Маст. лит, 1988. — 141 с.

4. *Таўлай, В. П.* Дакументы, успаміны, артыкулы / В. П. Таўлай. — Мн. : Маст. літ., 1984. — 238 с.
5.*Гніламёдаў, У. В.* Сацыялістычны рэалізм / У. В. Гніламёдаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі / гал. рэд. І. П. Шамякін : у 5-і т. — Мн. : БелСЭ, 1986. — Т. 4. — с. 655 – 660

***Н. В. Кардычкіна***
*Навуковы кіраўнік — Т. М. Пучынская*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ САНЕТА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Беларуская паэзія — багаты свет глыбіні і неабсяжнасці думкі, які не можа не здзіўляць сваёй шматграннасцю і жанравай разнастайнасцю. На сучасным этапе развіцця літаратуры з'яўляецца вялікая колькасць новых формаў ужо ўсталяваных і трывала замацаваных жанраў, што звязана з працэсамі маргіналізацыі. Ускладненне жыцця ўплывае на свядомасць чалавецтва. Мастак слова як чалавек свайго часу суадносіць асабісты свет з праблемамі грамадства, ствараючы такім чынам непадзельнае «я-мы». П. В. Васючэнка адзначае, што «вялікі пісьменнік не адлюстроўвае, а пераадольвае і перастварае рэчаіснасць. Ён творыць свой уласны свет, з адпаведнай сістэмай каардынатаў, з унікальнымі прасторай і часам» [2, с.180].

Аўтарская задума (сістэма каардынат мастацкай думкі) непаўторная, таму ўзнікаюць новыя спосабы выражэння ідэі, жанравыя формы, абумоўленыя гістарычнай эпохай і фактарамі жыцця: сацыяльнымі, палітычнымі, тэхнічнымі і іншымі. Новыя жанравыя формы замацоўваюцца ў літаратуры і развіваюцца наступнымі пакаленнямі таленавітых аўтараў. Так, у XIII стагоддзі з'явіўся санет, радзімай якога многія даследчыкі прызнаюць Сіцылію, а «бацькам» — італьянскага паэта сіцылійскай школы Джакома да Лянціна. Ён заклаў пачатак жанру, а яго паслядоўнікі Ф. Петрарка, А. Дантэ, Лопэ дэ Вега, У. Шэкспір і іншыя прадстаўнікі сусветнай літаратуры — працяг і сталае развіццё.

Кожная літаратура, запазычаючы санет у сваю скарбніцу, надае адметны ёй нацыянальны каларыт, стварае розныя санетныя формы: італьянскі (Ф. Петрарка, А. Дантэ); французскі (Пьер дэ Рансар); англійскі (Ф. Сідні, У. Шэкспір); рускі складаны санет (А. А. Ржэўскі) і іншыя.

Зараджэнне беларускага санета ў параўнанні з сусветнай літаратурай суправаджалася тэмпам «часавага спазнення», што ўжо ў XX стагоддзі перайшоў у тэмп паскоранага развіцця. Адным з пераканальных доказаў гэтай паскоранасці, лічыць Р. Бярозкін, з'яўляюцца санеты Я. Купалы [4, с.24]. Узбагачэнне беларускага санетарыю набыткамі сусветнага досведу праяўляецца ў развіцці дзвюх супрацьлеглых тэндэнцый: купалаўска-коласаўскай, якая арыентуецца на адыход ад прынятых канонаў і імкненне трансфармаваць іх, і багдановічаўскай, у аснове якой ляжыць класічны санет.

Узаемасувязь паміж традыцыйнай класікай і наватарствам з'яўляецца галоўнай умовай плённай паэтычнай творчасці сучасных аўтараў, якія ствараюць санетныя наватворы і пашыраюць літаратурную спадчыну. Пачынаючы з другой паловы XX стагоддзя, пісьменнікі актыўна шукаюць новыя санетыя формы, што тлумачыцца шматлікімі пагранічнымі праявамі грамадскага жыцця гэтага перыяду: хрушчоўская адліга, брэжнеўскі застой, перабудова, утварэнне Рэспублікі Беларусь; экалагічныя катастрофы, змена стагоддзяў.

Тэорыя беларускай санетыстыкі да 90-х гадоў XX стагоддзя добра асветлена ў даследаваннях А. У. Сенькаўца, В. П. Рагойшы, Т. М. Федарцовай і іншых. Нягледзячы на наяўнасць літаратуразнаўчых даследаванняў, адзначым наступную заканамернасць: развіццё тэорыі заўсёды спазняецца ў параўнанні з творчай практыкай, і шматлікія наватворы застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў.

Пошук новых жанравых формаў у сучаснай беларускай літаратуры можна назваць працэсам трансфармацыі, што ад лацінскага transformatio — ператварэнне — пераўтварэнне, змяненне выгляду, формы, значных рыс чаго-небудзь [5]. У дачыненні да санета — гэта разняволенне, рэканструкцыя класічных канонаў формы. Цікавасць выклікаюць эксперыментальныя беларускія санеты Р. Барадуліна (санет-акраверш), Э. Валасевіча (санет-байка), Л. Дранько-Майсюка (трохдольнік), Ю. Пацюпы (санет-газэль-туюг, санет-цэнтон, санет-брахікалан) і С. Мінскевіча (гіперсанет) і іншыя творы, што вызначаюцца сваёй складанасцю і непаўторнасцю.

Пісьменнікі-санетысты перастварыюць мінулыя формы, прымушаюць гучаць іх па-новаму, па-сучаснаму. За неардынарнасцю ідэі санетных знаходак, знешняй сціпласцю іх інтанацыі, нязвыкласцю структуры паўстае душа «хамуціуса» часу — пісьменніка, які жыве ўласнымі памкненнямі і ўводзіць чытача ў чароўны свет санетнага радка.

Сучасныя паэты імкнуцца знайсці асабісты шлях спалучэння класікі і наватарства, ствараючы санеты, нязвыклыя па сваёй структуры («Ау, дах!» С. Мінскевіча), памеры (брахікалан Ю. Пацюпы), змесце (цыкл Р. Барадуліна «Палыновыя санеты»). Напрыклад, санет «Ау, дах!» С. Мінскевіча з нізкі «Мінскія/Менскія санеты» пабудаваны ў форме сэрца, з якім асацыіруецца ўпісьменніка родны горад:

І хоць на ўзвышшы Менск —
Збірае ўсё, як сэрца. [3, с.51]

Нязвыкласцю будовы вызначаецца твор Ю. Пацюпы «Павучаньне» — «трайны санет з двайным кодам» (аўтарскае азначэнне), што напісаны шасцістопным ямбам. Санет Ю. Пацюпы можна чытаць цалкам